# ДА ПРАБЛЕМЫ ВЫЛУЧЭННЯ «НЁМАНСКАГА КУЛЬТУРНАГА КОЛА» Ў НЕАЛІЦЕ ЛЯСНОЙ ЗОНЫ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ

***Юрэцкі С.С.,***
*загадчык аддзела археалогіі першабытнага грамадства*
*ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, канд. гіст. навук*

Нёманская культура з'яўляецца супольнасцю эпохі неаліту, якая існавала на шырокай прасторы ў склад якой уваходзіць Беларускае Панямонне, паўднёвая частка Літвы, паўночна-заходняя частка басейна Прыпяці, а таксама ніжняя частка басейна ракі Буг і міжрэчча Одры і Віслы.

Значная тэрыторыя, якую займала нёманская культура (храналогія яе існавання вызначаецца ад пачатку 4 тысячагоддзя да н.э. да пачатку 2 тысячагоддзя да н.э.), выклікала і ўвагу да яе з боку даследчыкаў як у Беларусі, так і суседніх краін: пераважна Польшчы, а таксама Літвы і Украіны. На працягу апошніх 15 год актывізаваліся даследаванні старажытнасцей нёманскай культуры на тэрыторыі Польшчы. У польскай гістарыяграфіі нават узнікла новае паняцце «нёманскае культурнае кола» [4, s. 21]. З улікам таго, што «нёманскае культурнае кола» непасрэдна закранае матэрыялы з тэрыторыі Заходняй Беларусі (перадусім Беларускага Панямоння) актуальным з'яўляецца крытычны разгляд сутнасці новага паняцця.

Мэтай даследавання з'яўляецца навуковая крытыка прапанаванага ў польскай археалогіі паняцця «нёманскае культурнае кола» як альтэрнатыўнага вызначэння старажытнасцей нёманскай культуры.

**Матэрыял і метады.** Праца выканана на падставе архіўных крыніц з Фонда археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама кола археалагічных крыніц (перадусім керамікі эпохі неаліту). Праведзенае даследаванне грунтуецца на коле метадаў, у аснову якіх пакладзены прынцыпы комплекснага падыходу, гістарызму і аб'ектыўнасці. Выкарыстоўваліся фармальна-тыпалагічны, картаграфічны і гісторыка-параўнальны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Матэрыялы нёманскай культуры з тэрыторыі Беларускага Панямоння, якія ідэнтыфікуюцца ў межах дадзенай супольнасці, немагчыма разглядаць адасоблена ад усяго рэгіёна распаўсюджвання нёманскай культурнай традыцыі. Таму на дадзеным этапе даследаванняў было неабходным правядзенне карэляцыі даных з суседніх рэгіёнаў арэала нёманскай культуры з мэтай вылучэння агульных этапаў у яе развіцці. Наступным крокам з'яўлялася вылучэнне асобных лакальных асаблівасцей распаўсюджвання гэтай супольнасці на тэрыторыі Беларускага Панямоння.

У выніку праведзенага аўтарам даследавання керамікі эпохі неаліту былі вылучаны два асноўныя этапы развіцця для ўсяго арэала нёманскай культуры: ранні і класічны [1, с. 14].

Культурнавызначальныя характарыстыкі нёманскай культуры праявіліся пераважна ў керамічным комплексе. Адметнай рысай нёманскай культуры з'яўляецца наяўнасць ямкавых наколаў знутры альбо пачарговых знутры і звонку пад краем венца. У якасці тыповых элементаў арнаментацыі разглядаюцца адступаючыя наколы ў выглядзе капыткоў, «семечкі», а таксама пракрэсленыя лініі і лінейны штамп. Асаблівасцю начынняў нёманскай культуры з'яўляецца таксама S-падобная прафіляванасць гаршкоў з вылучанай шыйкай.

Станаўленне нёманскай культуры адбывалася на аснове мясцовых традыцый ранняга неаліту, якія прадстаўлены ў матэрыялах прыпяцка-нёманскай культуры. На карысць дадзенага палажэння сведчыць пераемны характар элементаў аздаблення (разнастайныя наколы і грабеньчаты штамп), вастрадонная форма начынняў, а таксама супадзенне арэалу дзвюх культур на тэрыторыі Беларускага Панямоння. У той жа час з'яўленне такіх своеасаблівых рыс ранняга этапу нёманскай культуры як S-падобная прафіліроўка гаршкоў, распаўсюджванне лінейнага штампа і загладжванне знешніх паверхняў начынняў дазваляе казаць аб значным уплыве пры фарміраванні культуры з боку традыцый супольнасцей цэнтральнаеўрапейскага аграрнага неаліту.

Абгрунтаванасць вылучэння альтэрнатыўнага паняцца «нёманскае культурнае кола» адбылася ў працы Д. Манастэрскага. Вызначэнне дадзенага кола заключаецца ў існаванні на прасторах ад верхняга Панямоння і верхняй Прыпяці да сярэдняга Павіслення культурнай супольнасці эпохі неаліту (у Д. Манастэрскага – «o charakterze paraneolitycznym»), што абапіраецца на сукупнасці гаспадарча-грамадскага кшталту [4, s. 21].



Рэпазіторый ВГУ

Узнікае шэраг пытанняў да вызначэння сутнасці такога новага паняцця як «нёманскае культурнае кола». Гаспадарча-грамадскі стан носьбітаў нёманскай культуры і культурнай традыцыі тыпу Лінін застаецца маладаследаваным. У першую чаргу гэта тлумачыцца характарам наяўных крыніц. Даследчыкам не вядомыя пахавальныя комплексы названых супольнасцей, якія маглі б стаць надзейнай крыніцай па тэматыцы светапогляду, сацыяльнай структуры і г.д. У выніку праведзенага аўтарам дысертацыйнага даследавання быў апісаны ўвесь спектр зафіксаваных на дадзены момант аб’ектаў, якія патэнцыйна могуць звязвацца з керамікай (супольнасцямі) эпохі неаліту на тэрыторыі Беларускага Панямоння [1, с. 8–9]. Большасць з названых аб’ектаў немагчыма дакладна ахарактарызаваць паводле паходжання, а іх запаўненне адметнае змешанасцю розначасовых матэрыялаў. Фактычна такі ж стан маюць і аб’екты з матэрыяламі нёманскай культуры і тыпу Лінін на прылеглых да Беларускага Панямоння тэрыторыях [2, s. 158–161].

Згаданыя акалічнасці абумовілі і слабую вывучанасць, з-за немагчымасці падзелу матэрыялаў, крамянёвага інвентару названых супольнасцей. Таму асаблівасці «нёманскага культурнага кола» могуць быць вызначаны фактычна толькі па адметным рысам керамікі, а таксама па натуральным характары гаспадаркі ў параўнанні з суседнімі аграрнымі культурамі.

Выклікае пытанне таксама адсутнасць у прапанаваных Д. Манастэрскім групах «нёманскага культурнага кола» матэрыялаў з міжрэчча Одры і Віслы [4, s. 21], якія ўведзены ў навуковы ўжытак у шэрагу публікацый Б. Юзвяка і С. Дамарадзкай [2, s. 189–209; 3, s. 87–102].

Таму, на сучасным этапе вывучэння керамікі, неабходным з’яўляецца падзел нёманскай культуры на ранні і класічны этапы. Матэрыялы тыпу Лінін неабходна аднесці да асобнай таксанамічнай адзінкі.

**Заключэнне.** Такім чынам, тэрмін “нёманскае культурнае кола”, як паказалі вынікі даследавання, не адпавядае сучасным даным наконт развіцця чалавечых супольнасцей эпохі неаліту на тэрыторыі Беларускага Панямоння.

Агульным прынятым таксонам, які на сучасным узроўні навукі адэкватна характарызуе разгледжаныя ў працы старажытнасці, з’яўляецца нёманская культура.

1. Юрэцкі, С.С. Кераміка эпохі неаліту Беларускага Панямоння: тэхналогія, тыпалогія, культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя : аўтарэф. дыс.… канд. гіст. навук па спецыяльнасці археалогія (07.00.06) / С.С. Юрэцкі – Мінск, 2018. – 25 с.
2. Józwiak, B. Społeczności subneolitu wschodnioeuropejskiego na Niżu Polskim w międzyrzeczu Odry i Wisły / B. Józwiak. – Poznań : Uniw. im. A. Mickiewicza w Poznaniu, 2003. – 438 s.
3. Józwiak, B. Studia nad osadnictwem społeczności subneolitycznych w Polsce Północno-Wschodniej. Zarys problematyki / B. Józwiak, S. Domaradzka // Na rubieży kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesną epoką brązu. / pod red. U. Stankiewicz, A. Wawrusiewicza. – Białystok, 2011. – S. 87–102.
4. Manasterski, D. Puchary Dzwonowate i ich wpływ na przemiany kulturowe przełomu neolitu i epoki brązu w północno-wschodniej Polsce i na Mazowszu w świetle ceramiki naczyniowej / D. Manasterski // Światowit : rocz. Inst. Archeol. Uniw. Warszaw. Fasc. B, Archeologia Pradziejowa i sredniowieczna. – Warszawa : Inst. Archeol. UW, 2016. – Vol. 19. – 159 s.

## РАЗРАБОТКА ЭКСКУРСИИ «ЛИТЕРАТУРНЫЕ СТРАНИЦЫ ВИТЕБСКОГО КРАЯ»

***Якимова И.И.,***
*студентка 4 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Николаева И.В., канд. ист. наук, доцент*

На сегодняшний день литературный туризм успешно развивается и набирает популярность во многих странах мира. Туристы, увлекающиеся литературой, с большим интересом отправляются в тематические туры. В то же время, имеющиеся на туристическом рынке Беларуси литературные экскурсии немногочисленны и имеют достаточно узкую тематику. Тогда как Витебская область, которая имеет все возможности для развития литературного туризма, уступает в этом другим регионам республики.

Целью настоящего исследования стала разработка экскурсионного литературного маршрута по Витебскому краю как нового туристско-экскурсионного предложения для жителей нашей страны и зарубежных туристов.

**Материал и методы.** Теоретической основой для исследования стали труды отечественных и зарубежных специалистов в области теории и практики туристической деятельности и экскурсоведения (Б.В. Емельянов, Н.В. Савина, Г.Р. Потаева), а также исследователей литературного туризма (В.В. Лапочкина, Т.А. Силаева, А.В. Фирсова, В.Н. Шолохов), с помощью ко-

Репозиторий ВГУ